Спорт-тайм

# Трыумфальнае завяршэнне

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра заканчэнне чэмпіянату Еўропы па біятлоне і іншыя актуальныя падзеі выхадных**

***1. Беларускія спартсмены занялі першае месца ў медальным заліку на чэмпіянаце Еўропы па біятлоне ў Раўбічах.*** На вышэйшую прыступку п'едэстала ўзнялася біятланістка зборнай Алена Кручынкіна, якая выйграла гонку пераследу, таксама двухразовым чэмпіёнам Еўропы стаў Сяргей Бачарнікаў, які быў найлепшым у суперспрынце і пасьюце. Бронзавы медаль у скарбонку беларускай каманды прынесла і Ірына Крыўко ў спрынце.

Другое месца ў медальным заліку заняла зборная Расіі — 4 узнагароды (2 залатыя і 2 сярэбраныя). На трэцяй пазіцыі размясціліся нарвежскія спартсмены, у актыве якіх 6 медалёў (1 залаты, 2 сярэбраныя і 3 бронзавыя).

Госці чэмпіянату па яго заканчэнні не скупіліся на высокія ацэнкі арганізацыі турніру. «Уся Еўропа гэтай зімой атрымала няпросты выклік — снегу сапраўды мала, але Раўбічы правілі сябе бліскуча, так арганізаваўшы трасу чэмпіянату Еўропы, дзякуй», — адзначыў **кіраўнік Міжнароднага саюза біятланістаў Оле ДАЛІН.**

Удзел у чэмпіянаце Еўропы — 2020 па біятлоне прынялі каля 270 спартсменаў у складзе 35 камандаў. Біятлоннае свята ў Раўбічах працягнецца Кубкам IBU, які з 4 да 7 сакавіка прыме Беларусь.



***2. Арына Сабаленка стала пераможцай турніру катэгорыі «Прэм'ер» з прызавым фондам $ 2,9 млн у катарскай Досе.*** У фінале яна перамагла чэшку Петру Квітаву — 6:3, 6:3, сустрэча працягвалася 1 гадзіну 14 хвілін.



Аляксандр Лукашэнка павіншаваў тэнісістку з пераканаўчай перамогай на турніры. «Віншую цябе з заваяваннем першага ў новым сезоне трафея на турніры WTA. Яскравы поспех у Досе — гэта вынік нясхільнага спартыўнага характару і сілы духу. Сваёй прыгожай гульнёй ты падарыла сапраўднае свята ўсім беларускім балельшчыкам», — гаворыцца ў віншаванні. «Чакаем новых упэўненых перамог. Мы ў цябе верым!» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Для Арыны гэта шосты чэмпіёнскі тытул на турнірах пад эгідай WTA. Перамогшы ў Катары, Сабаленка зарабіла $ 605 тысяч, а таксама 900 ачкоў, што дазволіла ёй падняцца на некалькі пазіцый у сусветным рэйтынгу. Цяпер яна займае 11-е месца. На першым замацавалася Эшлі Барці (Аўстралія), другі радок за Сімонай Халеп (Румынія), на трэцяй пазіцыі Караліна — Плішкава (Чэхія).

***3. Беларускія спартсмены заваявалі чатыры ўзнагароды (дзве залатыя, адну сярэбраную і адну бронзавую) на міжнародным турніры па дзюдо European Judo Open, які прайшоў з 29 лютага да 1 сакавіка ў Варшаве.*** У апошні дзень турніру на вышэйшую прыступку п'едэстала ўзняўся беларус Аляксандр Сідорык (вагавая катэгорыя 90 кг), бронзавая ўзнагарода дасталася Віктару Кляусаву. Раней Ульяна Мінянкова (57 кг) заваявала залаты медаль, Ксенія Даніловіч (52 кг) узнімалася на другую прыступку п'едэстала.

Удзел у турніры ўзялі каля 400 спартсменаў з 44 краін.

***4. Пасля групавога этапу вызначыліся ўсе ўдзельнікі першага раўнда плэй-оф гандбольнай Лігі чэмпіёнаў.*** Польскі «Віве» з Кельцэ, за які гуляюць беларусы Арцём Каралёк і Уладзіслаў Кулеш, сустрэнецца са славенскім «Цэле». Таксама за выхад у чвэрцьфінал ЛЧ згуляюць:

«Дынама» (Бухарэст, Румынія) — «Пары Сэн-Жэрмен» (Францыя);

«Вісла» (Плоцк, Польшча) — «Веспрэм» (Венгрыя);

«Вардар» (Скоп'е, Паўночная Македонія) — «Пік» (Сегед, Венгрыя);

«Порту» (Партугалія) — «Ольбарг» (Данія);

«Фленсбург» (Германія) — «Манпелье» (Францыя).

Першыя матчы 1/4 фіналу пройдуць 18—22 сакавіка, у адказ — 25—29 красавіка. Напрамую ў чвэрцьфінал выйшлі пераможцы дзвюх папярэдніх груп — іспанская «Барселона» і нямецкі «Кіль».

Нагадаем, Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова не змог прабіцца ў плэй-оф, занямшы сёмае месца ў групе B.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.53 | 18.51 | 10.58 |
| Віцебск — | 7.44 | 18.39 | 10.55 |
| Магілёў — | 7.43 | 18.41 | 10.58 |
| Гомель — | 7.38 | 18.39 | 11.01 |
| Гродна — | 8.07 | 19.07 | 11.00 |
| Брэст — | 8.06 | 19.09 | 11.03 |

### Месяц

*Першая квадра 2 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

### Імяніны

*Пр. Кузьмы, Льва.*
*К. Марыны, Геранiма, Фелікса.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 3 САКАВІКА




**1855** год — нарадзіўся Палікарп Рыгоравіч Бывалькевіч, беларускі журналіст. Выкладаў у Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. З 1891-га — рэдактар газет «Віленскі веснік», «Заходні веснік», «Ускраіны Расіі». У 1904 годзе ў Мінску заснаваў газету «Беларускі веснік». Аўтар фальклорна-этнаграфічнага даследавання «Янка Купала».

**1895** год — нарадзіўся Васіль Сяргеевіч Галоўскі, военачальнік, генерал-маёр (1942), удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Адзін са стваральнікаў і камандзір Асобнай Кубанскай казачай кавалерыйскай дывізіі, якая ў гады Айчыннай вайны здзяйсняла рэйды па варожых тылах войскаў, удзельнічала ў бітвах пад Масквой, Сталінградам, у Беларускай аперацыі, дайшла да Будапешта і Прагі. Падчас вызвалення Беларусі злучэнні і часці конна-механізаванай групы, пераследуючы праціўніка ў напрамку Слуцк — Стоўбцы, пад агнём варожай авіяцыі крыху больш чым за суткі з баямі прайшлі па тылах ворага каля 110 км, удзельнічалі ў вызваленні Стоўбцаў, гарадскіх пасёлкаў Мір, Гарадзея, горада Нясвіж, адразаючы сапернiку шляхі адыходу з Мінска на Баранавічы, Брэст і Лунінец.

**1900** год — нарадзіўся Герасім Васільевіч Якушка, беларускі архітэктар. У 1936—1941 гадах галоўны архітэктар Мінска.



**1920** год — нарадзіўся (у цяперашнім Уздзенскім раёне) Іван Сямёнавіч Козіч, Герой Савецкага Саюза (1943). У Чырвонай Арміі з 1938 года. У Вялікую Айчынную лётчыкам-знішчальнікам старшына Козіч здзейсніў 423 баявыя вылеты, правёў 31 паветраны бой, збіў 20 варожых самалётаў.




**1860** год — нарадзіўся Аляксей Яўграфавіч Фаворскі, расійскі хімік-арганік, стваральнік навуковай школы, акадэмік АН СССР, Герой Сацыялістычнай Працы.

**1920** год — у Маскве адкрыўся Дом друку (цяпер — Цэнтральны Дом журналіста).



**1925** год — нарадзілася Рыма Васілеўна Маркава, расійская кінаактрыса, народная артыстка Расіі. Здымалася ў фільмах «Бабіна царства», «Жураўушка», «Сібірачка», «Абрыў».

**1940** год — нарадзіўся Георгій Якаўлевіч Мартынюк, расійскі артыст тэатра і кіно, народны артыст Расіі. Здымаўся ў фільмах «Цішыня», «Гібель эскадры», «Шчыт і меч», у тэлевізійным серыяле «Следства вядуць знатакі».

**1955** год — указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР уведзена званне «Адмірал Флоту Савецкага Саюза» — найвышэйшае вайсковае званне ў ВМФ СССР. Упершыню тым жа ўказам гэта званне было прысвоена адміралам Івану Ісакаву і Мікалаю Кузняцову з уручэннем спецыяльнага знака ўзнагароды «Маршальская зорка».

**1980** год — у Вене прынята Канвенцыя ААН аб фізічнай абароне ядзерных матэрыялаў.

## УСМІХНЕМСЯ

**Пяць з шасці вучоных пацвердзілі, што гульня «руская рулетка» — гэта бяспечна.**

Няма нічога больш праставата, чым ускладніць сабе жыццё.

**— Рабіновіч, за што вы трапілі ў турму?**
**— За хабар.**
**— А за што вас так хутка выпусцілі?**
**— А як вы думаеце?**

Якаў Данілавіч павучае сына:
— Марык, запомні, справядлівасць — гэта калі ўсім дастаецца пароўну! А табе — трошкі больш...

**На кірмашы:**
**– У вас хурма вяжа?**
**– Такі я вас прашу – крыжыкам вышывае!**

— Доктар, у мяне баліць усё!
— Ну, гэта вы пагарачыліся — на ўсё ў вас грошай не хопіць.

**У доме вэрхал. Стаю з венікам і разважаю: прасцей прыбрацца ці паляцець?**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 937.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 сакавіка 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12